УДК821.161.3+82-31

**М.С. Рак**
(Мінск, Беларусь)

# ГАТЫЧНАЯ ТРАДЫЦЫЯ І СРОДКІ ЯЕ ВЫЯЎЛЕННЯ Ў АПАВЯДАННЯХ І РАМАНЕ ЛЮДМІЛЫ РУБЛЕЎСКАЙ «СКОКІ СМЕРЦІ»

*У артыкуле разглядаюцца сродкі і спосабы выяўлення гатычнай традыцыі ў творах Людмілы Рублеўскай, акрэсліваюцца асноўныя вобразы, сімвалы і гатычныя топасы ў апавяданнях і рамане пісьменніцы «Скокі смерці». Адзначаецца, што*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*гатычная стылістыка дапамагае пісьменніцы паказаць мінулае і сучаснасць у іх непарыўнай сувязі.*

Людміла Рублеўская, як ужо неаднаразова адначалася, выступае ў сваёй прозе свядомай паслядоўніцай Уладзіміра Караткевіча, у многім наследуе закладзеныя ім традыцыі (узнаўляе ў тэкставай прасторы жанравыя адзнакі масавай літаратуры, папулярызуе сівую даўніну, закранае важныя для функцыянавання нацыі пытанні, выкарыстоўвае неарамантызм, неаготыку і інш.), але, тым не менш, яна выявілася як самабытны і арыгінальны аўтар, наватар-стваральнік уласных жанраў і міжжанравых спалучэнняў, які вынайшаў сакрэт «смачнай прозы». На жанравую дыфузію прозы пісьменніцы ўплываюць узаемаадносіны / узаемастасункі двух светаў – рэальнага і таямнічага, містычнага, вусцішнага: «важкасць элементаў "гатычнай" паэтыкі нават у такіх "містычных" творах, як аповесці "Дзеці Гамункулуса" (2000), "Ночы на Плябанскіх млынах" (2006), абумоўлена зусім не жаданнем забаўляць чытача, палохаючы яго: хутчэй варта гаварыць пра актуалізацыю традыцый рэнесанснай навелістыкі, еўрапейскага і беларускага рамантызму з выразна асветніцкімі мэтамі» [3, с. 31]. Дададзім, што выказанае меркаванне І.Л. Шаўляковай-Барзенкі ў поўнай ступені датычыцца і гатычных апавяданняў «Шклянка цемры з прысмакам крыві», «Дыярыуш пані», «Жаніх пані Данусі» і гатычнага рамана «Скокі смерці».

У апавяданнях «Шклянка цемры з прысмакам крыві», «Дыярыуш пані», «Жаніх пані Данусі» Л. Рублеўская шырока выкарыстоўвае гатычныя матывы і тэмы: дзеянне адбываецца ў змрочных замках, сядзібах, касцёлах, на могілках, з'яўляюцца інфернальныя істоты, чытач запалоханы прадчуваннем блізкай трагедыі. У першым з названых твораў пісьменніца не аднойчы стварае гатычны антураж: «дасканалыя дэкарацыі для гатычнага рамана», «прывідныя мніхі, пустыя рыцарскія латы, якія ходзяць па замкавых сценах, жывыя трупы і замураваныя мнішкі», «класічна гатычнай свечкі», «герой гатычнага рамана» [2, с. 443–445]. Готыка не перашкаджае «разгортванню» трагедыі чалавечых лёсаў: савецкага афіцэра «ўнука буржуазнага нацыяналіста і цемрашала» [2, с. 444] Сапяжынскага і Валянціны (супрацоўніцы КДБ), якіх жыццё выпрабоўвае на чалавечнасць. У «Дыярушы пані» таксама прысутнічаюць гатычныя матывы і вобразы: прадчуванне трагедыі і смерці, міфічныя істоты, вядзьмарка, баль пад час мору. «Жаніх пані Данусі» мае аўтарскую дэфініцыю – жахлівае апавяданне, дзеянне ў ім разгортваецца на Кальварыі, пісьменніца выпрабоўвае «на мясцовай гісторыка-культурнай глебе <…> вобразна-выяўленчы інструментарый містычнага адгалінавання рамантызму і "літаратуры жахаў"» [4, с. 1076].

У рамане Л. Рублеўская «Скокі смерці» выкарыстоўвае паралельны хранатоп як прынцып пабудовы тэкставай прасторы: наша сучасніца журналістка Ганна Барэцкая бачыць сны аб сваім двайніку эпохі позняга Сярэднявечча Анэце Лескевічанцы – дачцэ бургамістра «вольнага граду» XV стагоддзя Старавежска, «праходзіць» яе жыццёвы шлях. Сам жанр гатычнага рамана, як абалонка твора, абраны пісьменніцай наўмысна: звяртаючыся да таямніц і загадак змрочнага было-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

га, Л. Рублеўская імкнецца падкрэсліць сувязь мінуўшчыны і будучыні, паказаць, да чаго можа прывесці выкарыстанне звышзброі прагнучымі сусветнага панавання людзьмі, якія імкнуцца маніпуляваць іншымі. «Скокі смерці» становяцца раманам «жахаў і таямніц», разгадаць якія героям дапамагае не толькі апантанасць нацыянальным быццём і гісторыяй, але і сны галоўнай гераіні, якія пераносяць яе ў Сярэднявечча.

Л. Рублеўская ідзе ўслед за жанравым канонам: яе раман заснаваны на незвычайным сюжэце (гадзіннікавых спраў майстар і лекар вялікага князя Гервасій Бернацоні вынайшаў у даўнія часы звышзброю, якая складаецца з 12 гадзіннікаў, здольную знішчаць чалавечую волю), дзеянне адбываецца ў незвычайных абставінах (ратуша, старажытны замак, закінутая мясцовасць, сутарэнні і г. д.), рэалістычнасць апісання інтэр'еру і пейзажу толькі ўзмацняе вусцішнасць у творы (як у трылерах А. Хічкока). Варта адзначыць, што ў жанравай парадыгме рамана, нароўні з гатычнымі, выкарыстоўваюцца і рамантычныя, і дэтэктыўныя, і фантастычныя элементы, што адзначаюць вядомыя беларускія літаратуразнаўцы: «“Скокі смерці” – твор, які сінтэзуе элементы гатычнага, прыгодніцка-дэтэктыўнага, філасофскага раманаў, у якім удала злучаны нацыянальна-гістарычныя (этнанацыянальная самаідэнтыфікацыя беларусаў, захаванне гістарычнай памяці) і так званыя вечныя праблемы (пачуццё і доўг, вернасць)» [1, с. 150].

Назва твора адсылае чытача да змрочнай эпохі Сярэднявечча, калі ў Еўропе бушавала чума. Скокі смерці – алегарычны сюжэт жывапісу і літаратуры гэтага часу, від еўрапейскай іканаграфіі аб тленнасці зямнога быцця: персаніфікаваная Смерць вядзе да магілы прадстаўнікоў усіх слаёў грамадства і ўсіх узростаў – шляхту, духавенства, купцоў, сялян, мужчын, жанчын, дзяцей. Гераіня Л. Рублеўскай заўважае: «На гравюры быў тыповы матыў XV стагоддзя – танец смерці. Узяўшыся за рукі, падскоквалі ў вычварным танцы малады мніх, дзяўчына ў шляхецкім строі, немалады таўстун са смешна вырачанымі вачыма і шкілет. Над каржакаватай вежай – сонца і месяц, з'яднаныя ў адзін абыякавы твар, расколаты напалам [2, с. 223].

Раман пачынаецца апісаннем вар'яцкіх скокаў смерці ў XV стагоддзі і заканчваецца іх працягам у сучаснасці, што надае сюжэту дадатковую напружанасць і пацвярджае наш тэзіс аб паралельным тэкставым хранатопе: «Яны круціліся ў вар'яцкім карагодзе вакол ратушы ўжо дзясятую гадзіну. Неба зрабілася чырвоным, як распаленае жалеза. Цяжкі дым вогнішчаў, якімі адпалохвалі пошасць, слаўся па бруку, нібыта душы, што дарэмна праглі перад смерцю апошняга прычасця, не хацелі пакідаць зямлю...» [2, с. 76]; «Ніколі не забудуся таго відовішча. Нават цяпер, варта мне заплюшчыць вочы, я магу аднавіць яго ў дэталях. Сашчэпленыя рукі, вочы, якія нібыта глядзяць унутр чэрапа, выскаленыя твары... Шалёны карагод вярнуўся. Цяпер для тых, хто скакаў у ім, не мела значэння, хто каму служыць, хто над кім уладарыць» [2, с. 247].

У гатычных творах пісьменніцы прысутнічаюць і пераплятаюцца некалькіх часавых пластоў, а гісторыя краіны інтэрпрэтуецца і ўспрымаецца праз асабістае і сямейнае. У цэнтры аповеду, як правіла, аказваецца кананічны гатычны матыў радавога праклёну, які можа быць звязаны з рэальным грахом або злачынствам, што



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

перадаецца з пакалення ў пакаленне выпадковым, а часцей наўмысным знішчэннем уласнай гістарычнай памяці, што непазбежна прыводзіць да асобаснага крызісу. Яшчэ адзін важны гатычны матыў у творах Л. Рублеўскай – матыў ізаляцыі, які адлюстроўваецца ў адзіноце герояў. Цэнтральнымі персанажамі становяцца людзі, «не такія, як усе»: несучасныя «паненкі», паўстанцы, ідэалісты-выгнаннікі, добраахвотныя пустэльнікі, якія атрымліваюць канатацыйную ацэнку «вар'ят», «дзівак». Паколькі ў творах пісьменніцы гісторыя і лёс народа прадстаўлены праз гісторыю сям'і і асобы, то барацьба з адзінотай, пошук сябе і сваіх каранёў (праз дэтэктыўны сюжэт і расследаванне гістарычных таямніц) становіцца шляхам да разумення нацыянальнай ідэнтычнасці. У стварэнні атмасферы згубленасці, хаосу, ізаляванасці вялікая роля адводзіцца прасторава-часавай арганізацыі тэксту, што з'яўляецца яшчэ адной характэрнай рысай гатычнага жанру. Гатычны хранатоп прасочваецца ў «Скоках смерці» і спалучае рысы як класічнай, так і ўрбаністычнай готыкі.

Цэнтральны і нязменны вобраз гатычных твораў – замак – прысутнічае ў творы і трансфармуецца ў адпаведнасці з мясцовымі рэаліямі: гэта вежа, якую абыходзяць, як магілу вісельніка, маёнтак ўплывовага алігарха, старадаўні палац, апошні ўладальнік якога звар'яцеў. У рамане з'яўляюцца таксама і наступныя «гатычныя» топасы: халодныя пусткі, закінутыя дамы і могілкі, апусцелыя ўдалечыні ад цывілізацыі мястэчкі, сутарэнні, схаваныя пераходы і схованкі.

Як ужо адзначалася, пераважная пара года, у якую разгортваюцца падзеі, – восень, часта на мяжы з зімой, што стварае змрочную і трывожную атмасферу памірання і адзіноты: «Пошасць прыйшла ў Старавежск з восеньскім ветрам, перавітым сівым павуціннем, з горкім пахам верасу, і як павуцінкі бабінага лета, паляцелі лёсы ў невядомы вырай, пакідаючы жывым адчай збуцвелай лістоты. Спыняліся млыны, пераставалі стукаць молаты кавалёў, абміналі горад шаноўныя купцы, і тыя, хто застаўся жывы, не мелі чым прывязаць душу да цела...» [2, с. 77]. Дзеянне часта разгортваецца ў цёмны час або ў непагоду, калі неба нізка зацягнута шэрымі аблокамі, сонечныя промні вельмі рэдка з'яўляюцца на старонках.

У стылістыцы ўрбаністычнай готыкі горад і яго будынкі набываюць рысы падземнага царства мёртвых, дзе асфальт – рака Лета, мухі (інсекты) – вешчуны Аіда, зграі гарадскіх птушак нагадваюць магільныя крыжы, а транспарт параўноўваецца з ладдзёй Харона: «Паўпусты тралейбус пагрукваў, нібыта развальваўся. Я на хвілю ўявіла, што так можа выглядаць сучасны Харонаў транспарт. Вось прыпыніўся, каб прыняць у сябе новыя памерлыя душы...» [2, с. 113–114]. Вобраз смерці звязаны з матывам ачышчэння і набыццём пачуцця нацыянальнай свядомасці, калі, прыняўшы і памірыўшыся з мінулым, выправіўшы памылкі, герой, нарэшце знаходзіць сябе, гэта значыць з ценю і прывіду ператвараецца ў па-сапраўднаму жывога чалавека (што ў тэксце сімвалічна паказваецца як вяртанне да каханай, творчасці і здабыццё сямейнага шчасця). Гэта з'яўляецца адлюстраваннем тыповага для гатычнага рамана ўспрымання навакольнага свету: шматлікія апісанні руін падкрэсліваюць тэму адзіноты і незадаволенасці герояў рэчаіснасцю, а помнікі гісторыі (ператвораныя у недагледжаныя музеі ці сапсаваныя рэстаўрацыяй і еўрарамонтам) становяцца сімвалам разбурэння гісторыі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Такім чынам, гатычная традыцыя арганічна ўваходзіць у сучасны гістарычны раман Л. Рублеўскай дзякуючы актуальнасці сваёй праблематыкі: аднаўленне сямейных сувязяў і пераемнасці пакаленняў, ўсведамленне беларусамі нацыянальнай адметнасці, пошук раўнавагі ў хаатычным свеце. З дапамогай гістарычнай падсветкі аўтар падкрэслівае неабходнасць арыентацыі на мінулае для пабудовы дня сённяшняга, невыпадкова менавіта сучаснаму герою даецца шанец пераадолець грахі мінулага. Істотнай адметнасцю рамана становіцца ідэя пра нацыянальную ментальнасць беларускага народа, які заблукаў ў сваіх ўнутраных лабірынтах-сутарэннях. Гатычная стылістыка дазволіла Л. Рублеўскай белетрызавана паказаць мінулае і сучаснасць у іх непарыўнай сувязі, выявіць супярэчнасці ў гістарычным развіцці і адлюстраваць праблемы і комплексы новых пакаленняў, а таксама паразважаць над прычынамі і спосабамі іх пераадолення.

**Спіс літаратуры**


1. Бароўка, В. Ю. Раманы Людмілы Рублеўскай як мастацкі дыялог з жанравай традыцыяй / В. Ю. Бароўка // Białorutenistyka Białostocka. – Т. 7. – Białostock, 2015. – С. 147–160.

2. Рублеўская, Л. Ночы на Плябанскіх млынах : раман, аповесці, апавяданні / Л. Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 526 с.

3. Шаўлякова-Барзенка, І. Л. Проза / І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. ; НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. Беларус. культуры, мовы і літ. ; навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2015. – Т. 4, кн. 3. – С. 8–35.

4. Шаўлякова-Барзенка, І. Л. Рублеўская Людміла / І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. ; НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. Беларус. культуры, мовы і літ. ; навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2015. – Т. 4, кн. 3. – С. 1062–1084.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова